RAZAM.DE
BELARUSISCHE GEMEINSCHAFT

DANKESREDE. 23. MAI 2023

# УЗНАГАРОДЖАННЕ RAZAM ПРЭМІЯЙ ІМЯ ГУСТАВА ГЕЙНЕМАНА



А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
— Беларусы.

А што яны нясуць на худых плячах,
На руках ў крыві, на нагах у лапцях?
— Сваю крыўду.

А куды ж нясуць гэту крыўду ўсю,
А куды ж нясуць на паказ сваю?
— На свет цэлы.

А хто гэта іх, не адзін мільён,
Крыўду несць наўчыў, разбудзіў іх сон?
— Бяда, гора.

А чаго ж, чаго захацелась ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?
— Людзьмі звацца.

Шаноўнае спадарства, шаноўная апякунская рада, паважаныя сябры і сяброўкі СДПГ,

гэта быў верш беларускага народнага паэта Янкі Купалы, напісаны паміж 1905 і 1907 гадамі. Гэта па сёньняшні дзень яго самы вядомы верш. Мы пачалі менавіта зь яго нашую прамову, каб прыцягнуць увагу да беларускай мовы, культуры і ідэнтычнасьці, якія сёньня больш, чым калісьці, знаходзяцца пад пагрозай.

А таксама таму, што ён нясе ў сабе той дух, які ўвесь сьвет убачыў на пратэстах 2020 году і які аб'яднаў нас — беларускую дыяспару агулам і РАЗАМ у прыватнасьці — і які кіруе намі сёньня. Пачынаецца верш словамі:

“А хто там ідзе, а хто там ідзе

У агромністай такой грамадзе?

— Беларусы.”

Слова „грамада“ пазначае групу людзей, натоўп, але таксама можа быць патлумачана як насельніцтва, народ або грамадзтва. Такім чынам, ідзе цэлае грамадзтва, яно выходзіць на вуліцы. І што робяць гэтыя людзі? Яны нясуць на сваіх плячах сваю крыўду. І куды яны нясцуь яе? На сьвет цэлы.

Гэты стары верш апавядае пра пакуты, несправядлівасьць і прыгнёт - пасьля больш за 100 гадоў расейскага чужынскага панаваньня. Але гэта таксама гісторыя пра мужнасьць. Пра мужнасьць паўстаць, выйсьці на вуліцу і праявіць адвагу.

Як гэта і адбылося ў 2020 годзе, калі сотні тысячаў выйшлі на мірныя дэманстрацыі. Яны аб'ядналі намаганьні - віртуальна, ў чатах у Telegram, і ў рэальным жыцьці, праз дваровыя супольнасьці ў сваіх раёнах, на вуліцах або ў „Аўтазаку“, сумнавядомым перавозчыку зьняволеных. Яны праявілі салідарнасьць, таму што не маглі цярпець несправядлівасьці так нахабна сфальсіфікаваных выбараў, не маглі цярпець пакутаў, якія прынесьлі ім дзяржаўныя бандыцкія групоўкі, карумпаваныя судзьдзі і ка́ты ў турмах.

Завяршаецца верш пытаньнем: „А чаго ж, чаго захацелась ім, / Пагарджаным век, ім, сьляпым, глухім?'“

Адказ: „Людзьмі звацца.“

—

„Людзі'“, „чалавек'“ - гэтае слова стаіць на другім месцы ў Канстытуцыі ФРГ. Адразу паьсля слова „годнасьць“: „Годнасьць чалавека зьяўляецца недатыкальнай'“.

Гэты сказ падсумоўвае, верагодна, самае запаветнае жаданьне людзей пры любой дыктатуры, і гэта асабліва тычыцца Беларусі. Бо там кожны дзень топчуць унівэрсальную, натуральную і непарушную чалавечую годнасьць, зьбіваюць людзей дубінкамі, зачыняюць у халодныя камэры бяз вокнаў, адрываюць ад зьнешняга сьвету, зьняважаюць, катуюць і гоняць на сьмерць.

Паводле зьвесткаў праваабарончай арганізацыі „Вясна“, на сёньняшні дзень ня менш за 1525 чалавек у Беларусі лічацца палітвязьнямі.

Сярод зьняволеных людзі самых розных слаёў грамадзтва: навукоўцы і прафсаюзныя дзеячы, пэнсіянеры і студэнткі, старыя і цяжкахворыя, бацькі маленькіх дзяцей і нават непаўналетнія. Гэта зрэз ўсяго беларускага грамадства.

Узровень пакараньняў ужо даўно грунтуецца не на канкрэтных дзеяньнях, а на пагрозе для далейшага існаваньня рэжыму. Таму найвышэйшыя меры турэмнага пакараньня рэгулярна прымяняюцца да праваабаронцаў. Як і супраць так званых „чыгуначных партызанаў“, якія перадаюць стратэгічна важную інфармацыю пра перамяшчэньне расейскіх вайскоўцаў ва Ўкраіну і пасьпяхова сабатавалі праезд расейскай ваеннай тэхнікі празь Беларусь. Пры гэтым яны не нанесьлі шкоду ніводнаму чалавеку.

Сярод палітвязьняў ёсьць вядомыя людзі, напрыклад, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру Алесь Бяляцкі. Але большасць імёнаў тут, у Германіі, невядомыя, хаця гэта самыя сьмелыя і сьветлыя людзі Беларусі. Такія, як Паліна Шарэнда-Панасюк, „Берасцейская Жанна д'Арк“. Яе апошняе слова ў судзе ў чэрвені 2021 году стала выракам усяму рэжыму. Яна ўпарта адмаўлялася прызнаваць законнасьць суду, узьнялася з месца толькі таму, каб яе зноў ня зьбілі, і ўрэшце прамовіла, зьвяртаючыся да судзьдзі: „Крэсла, на якім вы сядзіце, і тое больш сумленнае за вас!“

Калі мы рыхтаваліся да гэтай прамовы, мы натрапілі на цытату, якая ўзрушыла нас да глыбіні душы. Яна належыць пяру гімназіста, які даўным-даўно напісаў яе для сваёй п‘есы. Радкі надзіва сугучныя з заключным словам Паліны Шарэнда-Панасюк у судзе:

„Я ніколі не пашкадую, што гаварыў ад імя праўды і справядлівасьці. Толькі праз праз жорсткі гвалт вы прымусіце мяне замаўчаць! Права застанецца правам! Вам давядзецца выслухаць мяне перад крэслам таго Судзьдзі, які аднойчы выклікае і вас!“

Гімназістам, які напісаў гэтыя словы, быў Густаў Хайнэман.

—

Споўнілася амаль тры гады, як у Беларусі зьявіўся першы палітвязень 2020 году, Сяргей Ціханоўскі. Вось ужо 75 дзён мы ня маем ад яго вестак.

Ад Марыі Калеснікавай, уганараванай летась прэміяй імя Карла Вялікага, у нас не было вестак 95 дзён. Учора мы даведаліся, што яна настолькі слабая, што ледзь можа хадзіць.

Або яе адвакат Максім Знак — 104 дні без навінаў. Апазыцыйны палітык Мікалай Статкевіч — 103 дні. А блогер Ігар Лосік — 94 дні.

27 дзён таму кандыдат у прэзідэнты Віктар Бабарыка быў дастаўлены зь ізалятара ў шпіталь з прыкметамі гвалту. З таго часу яго знаходжаньне невядомае. Лекары, якія рабілі яму аперацыю, былі арыштаваныя ў мінулыя выходныя. Сёньня ў Менску, пасьля 3 гадоў арышту, судзяць ягонага сына, Эдуарда. Яму пагражаюць да 20 гадоў пазбаўленьня волі. Бо ён сын апазыцыйнага палітыка.

Усё гэта страшыць, таму што ў нас ужо занадта шмат ахвяраў, якіх мы аплакваем - яны былі расстраляныя на дэманстрацыях, закатаваныя у турмах або зьніклі больш за 20 гадоў таму, калі лукашэнкаўскія эскадроны сьмерці палявалі на палітычных апанэнтаў.

Адначасова ў краіне пашыраецца масавая русіфікацыя. Рэжым Лукашэнкі паставіў Беларусь у беспрэцэдэнтную залежнасьць ад Расеі, што пагражае далейшаму існаваньню Беларусі як сувэрэннай дзяржавы.

Пачынаючы зь 2020 году, амаль мільён чалавек, то бок кожны дзясяты жыхар, былі вымушаныя пакінуць краіну.

Таму мы хочам і павінны выкарыстаць гэты вечар, каб зьвярнуцца да ўсіх вас:

**Палітвязьні не павінны проста зьнікнуць!**

**Беларусь як сувэрэнная дзяржава не павінна проста зьнікнуць!**

**Беларуская мова і культура не павінны проста зьнікнуць!**

—

Мы хацелі б падзякаваць вам усім за надзвычайны гонар быць ўзнагароджанымі Грамадзянскай прэміяй імя Густава Хайнэмана.

Мы хочам падзякаваць нашым актывістам і актывісткам ва ўсіх федэральных землях:

- якія нястомна працавалі для нашага згуртаваньня на працягу апошніх амаль 3 гадоў,
- якія выдаткоўвалі свой час, каб дапамагаць ўцекачам зь Беларусі, а потым і з Украіны,
- якія ахвяравлі грошы на падтрымку палітвязьняў,
- якія ўдзельнічалі ў дэманстрацыях па ўсёй Германіі,
- якія арганізоўвалі культурніцкуя імпрэзы,
- або распрацоўвалі сумесныя праекты з арганізацыямі беларускай эміграцыі.

Вы ўсе праявілі грамадзянскую мужнасьць і зрабілі свой унёсак у нашу мару аб дэмакратычнай будучыні Беларусі. Дзякуй, што мы сёньня знаходзімся тут і прымаем гэтую ўзнагароду ад імя ўсіх вас!

Нашая праца была б немагчымая без падтрымкі нашых нямецкіх сяброў:

- якія у якасьці сябраў згуртаваньня Разам прыўносяць каштоўныя подгляды і меркаваньні ў нашую працу,
- якія зьяўляюцца дзеячамі культуры і падтрымліваюць сваіх беларускіх калегаў, як праз стварэньне магчымасьцяў выступаць на сцэне, так і праз праграмы арт-рэзідэнцыяў,
- без падтрымкі нашых нямецкіх сяброў, якія ў якасьці журналістаў пішуць пра Беларусь,
- якія ушаноўваюць памяць ахвяраў рэпрэсіяў у Беларусі падчас набажэнстваў,
- якія пішуць лісты палітвязьням і прыходзяць на беларускія канцэрты і літаратурныя чытаньні.

Мы таксама дзякуем вам!

—

Гэтая ўзнагарода зьяўляецца на сёньняшні дзень самым высокім прызнаньнем, якое мы атрымалі за нашую працу. Яна матывуе нас працягваць нашую грамадзянскую дзейнасьць, таму што людзі ў Беларусі больш не могуць выходзіць на вуліцы. Адно крытычнае слова прывядзе іх ў турму на доўгія гады. Іх вымусілі замаўчаць, але не залішылі голасу, таму што мы будзем працягваць паведамляць пра іх і спрабаваць надаць ім голас.

Частка прэміі - дакладней: 1525 еўра - будзе накіраваная на нашую ініцыятыву дапамогі палітвязьням у Беларусі. Кожны эўра сымбалізуе аднаго з палітвязьняў.

Сёньняшні вечар надае нам крыху больш надзеі, таму што вы, шаноўныя сябры СДПГ, прысудзіўшы нам Прэмію імя Густава Хайнэмана, паказалі, што Беларусь не забытая.

**Дзякуй ад усяго сэрца!**